Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

Рэгіён

ЛІПЕНЬ 2014 г. № 6 (47)

НАВІНЫ РЭГІЁНА

В магазине в Белыничах изъят товар у предпринимательницы.

В белыничском магазине сотрудники инспекции МНС Республики Беларусь по Ленинскому району Могилева совместно с ОБЭП Ленинского РОВД выявили нарушения. Индивидуальная предпринимательница приобретала, реализовывала и хранила товар без документов, подтверждающих приобретение и отпуск в реализацию.

Всего из торговой точки в Белыничах, осуществляющей розничную торговлю женской, мужской и детской одеждой было изъято 363 единицы товара на Br102,5 млн. Как сообщили в отделе консультаций ИМНС РБ по Ленинскому району Могилева, в отношении индивидуальной предпринимательницы составлен протокол об административном правонарушении по ч.4 ст.12.17 КоАП Республики Беларусь. Материалы проверки направлены в экономический суд.

На Шклоўшчыне аднавілі помнік ахвярам Халакосту.

У вёсцы Рыжкавічы адкрылі адноўлены помнік яўрэям, загінулым у двух гета на тэрыторыі горада падчас Другой сусветнай вайны.

Ініцыятарам аднаўлення помніка на старых габрэйскіх могілках у вёсцы Рыжкавічы выступіла жыхарка Нью-Ёрка Дар’я Флэйр, продкі якой нарадзіліся ў Шклоўскім раёне.

Адноўлены помнік уяўляе сабой абеліск, пакрыты чорным мармурам. Побач з ім размешчана некалькі брацкіх магіл, на якіх указаны імёны загінулых, якія ўдалося ўстанавіць. Іх больш за 400.

ТАКІ ВОСЬ “РОСКВІТ”

Калі я заходжу ў сваю вясковую краму і бачу там звычайнае беларускае сала коштам па 120 тысяч рублёў за кілаграм, чамусьці мне не асабліва верыцца ў бравыя рапарты слаўных беларускіх чыноўнікаў і мудрых спецыялістаў Белстата пра тое, што простыя беларусы жывуць усё заможней і багацей.

Хаця, магчыма, так яно і ёсць – слаўныя беларускія чыноўнікі жывуць усё лепш, таму яны пра гэта і рапартуюць, што ж датычыцца простых беларусаў, дык што пра іх думаць і гаварыць, яны ж у нашай квітнеючай краіне маюць права толькі маўчаць ды ўхваляць нябывалыя дасягненні мудрых кіраўнікоў.

Таму простым бялынічанам ды круглянцам застаецца толькі радавацца паведамленням Дзяржстату пра бесперапынны рост заробкаў у роднай краіне – згодна падлікаў мудрых статыстыкаў, рэальны заробак беларусаў у студзенітраўні гэтага года павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам года мінулага на 3,6%. У мяне аж слёзы радасці на вочы наварочваюцца ад такога росту нашага дабрабыту.

Праўда, калі крыху пачынаеш задумвацца, плакаць хочацца ўжо па іншай прычыне – тыя ж мудрыя статыстыкі паведамляюць, што з пачатку гэтага года прадукты харчавання падаражэлі ўжо на 12%, а паслугі насельніцтву – на 14%. І гэты рост коштаў будзе працягвацца і найдалей…

Пра што казаць, калі па звестках тых жа статыстыкаў, са студзеня гэтага года ялавічына падаражэла на 76%, свініна – на 44% (не ведаю, праўда, дзе і як яны лічылі – па маіх падліках і па прыкідках усіх маіх знаёмых тая ж свініна падаражэла больш чым у два разы).

Зараз вось з 1 ліпеня зноў падняліся цэны на цыгарэты і гарэлку, у хуткім часе павінны падвысіцца кошты на паліва і шэраг камунальных паслуг. Мяркую, нават дурню зразумела, што шалёны рост цэн на прадукты, тавары і паслугі імгненна “з’ядае” усялякую прыбаўку да зарплаты.

Тым больш, што ў рэальнасці рост заробкаў у нашым рэгіёне існуе ў асноўным на паперы, бо большасць супрацоўнікаў прадпрыемстваў і арганізацый пра яго

(Заканчэнне на стар. 2)

БЯЛЫНІЦКІ РАЁН: УЛАДЫ ПА-РАНЕЙШАМУ НЕ ДАЮЦЬ НІЯКАЙ АФІЦЫЙНАЙ ІНФАРМАЦЫІ НАКОНТ ВЫПАДКАЎ ЗАХВОРВАННЯЎ СВІННЯЎ

Многія жыхары Бялыніцкага раёна ўсхваляваныя шматлікімі чуткамі пра тое, што ў раёне быццам бы былі зафіксаваныя выпадкі падзяжу свінняў ад інфекцыйнай хваробы – афрыканскай чумы свінняў. Мясцовыя ўлады ніяк не каментуюць гэтыя чуткі, адмаўляючыся даваць хоць нейкую канкрэтную інфармацыю занепакоеным вяскоўцам.

За апошнія тыдні выпадкі падзяжу свінняў ад невядомай хваробы былі зафіксаваныя ў аграгарадках Цяхцін і Вялікая Машчаніца, а таксама і ў вёсцы Лебедзянка Бялыніцкага раёна. Ва ўсіх такіх выпадках на месца здарэнняў выязджалі спецыялісты Бялыніцкай райветсанцыі, якія закопвалі загінуўшую жывёлу і праводзілі маштабную дэзінфекцыю. Пры гэтым ветырынарныя спецыялісты адмаўляліся даваць хоць нейкую інфармацыю наконт хваробы, ад якой загінулі свінні, спасылаючыся на тое, што гэта ім быццам бы забараніла рабіць непасрэднае кіраўніцтва.



Між тым некаторыя мясцовыя жыхары ўжо атрымалі пісьмовыя папярэджанні аб тым, што трымаць свінняў немэтазгодна ў сувязі з пагрозай захворвання на афрыканскую чуму.

У прыватнасці, такія папярэджанні за подпісам памочніка пракурора Бялыніцкага раёна атрымалі некалькі жыхароў аграгарадка Цяхцін, у якім раней мелі месца выпадкі падзяжу свінняў ад невядомай хваробы, пасля чаго ветэрынарныя спецыялісты выконвалі комплекс мерапрыемстваў па дэзінфекцыі. Людзі запатрабавалі тлумачэнняў ад ветэрынараў, ад якой жа хваробы загінулі жывёлы, аднак нейкага канкрэтнага адказу атрымаць так і не здолелі. Некаторыя са спецыялістаў казалі, што меў месца выпадак падзяжу свінняў ад звычайнай інфекцыі, іншыя сцвярджалі, што жывёлы загінулі ад простай чумы свінняў.

У аграгарадку Вялікая Машчаніца, дзе таксама меў месца выпадак падзяжу свінняў ад невядомай хваробы, улады перапісалі ўсе гаспадаркі мясцовых жыхароў, якія ўтрымліваюць гэту жывёлы. Таксама на мінулым тыдні на крамах у Машчаніцы з'явіліся абвесткі пра тое, што ў мэтах прафілактыкі АЧС у будынку Машчаніцкага сельвыканкама можна атрымаць мікрацыд для прыгатавання дэзраствора.

Жыхары Бялыніччыны ўсхваляваныя тым, што яны так і не здолелі атрымаць нейкай дакладнай інфармацыі наконт захворванняў свінняў. Многія з іх упэўнены, што мясцовыя ўлады спецыяльна прыхоўваюць выпадкі захворанняў жывёлаў афрыканскай чумой свінняў, каб інфармацыя не набыла шырокі розгалас у краіне. Вяскоўцы трымаюць свінняў, каб мець магчымасць выжыць у складаных умовах, заробкі ў большасці сяльгаспрадпрыемстваў Бялыніцкага раёна пакідаюць жадаць лепшага, іх не хапае нават на самае неабходнае. Зараз з-за адсутнасці дакладнай інфармацыі многія з іх пачалі прыразаць нават малаважкіх свінняў, каб не згубіць іх наогул – маўляў, так неафіцыйна рэкамендуюць ветэрынарныя спецыялісты.

З пункту гледжання грамадскіх актывістаў Бялыніцкага раёна, сваімі безадказнымі дзеяннямі па прыхоўванні дакладнай інфармацыі ад уласных грамадзян мясцовыя ўлады толькі ствараюць падставы для разнастайных чутак і панікі сярод насельніцтва.

У Бялыніцкім раёне ўсё пагалоўе свінняў у гаспадарках і ў фермераў раёна было ліквідавана яшчэ ў мінулым годзе, зараз свінагадоўляй займаюцца толькі прыватнікі. Між тым на тэрыторыі суседніх з Бялыніцкім Шклоўскага, Магілёўскага і Бярэзінскага раёнаў дзейнічаюць буйныя свінагадоўчыя комплексы.

Сяргей Семяновіч

(Працяг тэмы на стар. 4)

ТАКІ ВОСЬ "РОСКВІТ"

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

могуць толькі марыць. Многія сельгаспрадпрыемствы нават існуючыя мізэрныя заробкі сваім работнікам своечасова выплаціць не могуць, у чэрвені пачаліся затрымкі з выплатай зарплаты у некаторых арганізацыях рэгіёна.

Ну а ў нашых слаўных чыноўнікаў усё вельмі добра, "росквіт" працягваецца. І для іх гэта сабраўды так – яны ж зарабляюць не тры мільёны і ў крамы заходзяць не толькі на экскурсію, могуць дазволіць сабе купіць мяса па 160 тысяч за кілаграм.

Іван Барысаў

ЖКГ — ЗАГАДКАВАЯ КРАІНА

18 чэрвеня намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Анатоль Шагун распавёў журналістам аб завяршэнні працы камісіі пад кіраўніцтвам старшыні КДК Якабсона па вырашэнню праблемных пытанняў у сферы ЖКГ. Па выніках працы камісіі, як сказаў намеснік міністра, распрацаваны праект указа прэзідэнта, які “страсяне камунальшчыкаў”.

Што ж такога цікавага напрацавала камісія за некалькі месяцаў дзейнасці, каб прапанаваныя ёю рэформы дазволілі павысіць якасць і панізіць сабекошт камунальных паслугаў, узнялі на новы, больш якасны ўзровень рамонт і эксплуатацыю жыллёвага фонду, ды, нарэшце, як след “страсянулі камунальшчыкаў”?

Адной з асноўных прапаноў камісіі з’яўляецца ідэя па стварэнню жыллёвай інспекцыі, у якую войдуць прадстаўнікі “Дзяржбуднадзора”. Стварэнне інспекцыі, на думку намесніка міністра, дазволіць больш якасна і сістэмна падысці да эксплуатацыі, тэхнічнага абслугоўвання і капітальнага рамонту жылля незалежна ад форм уласнасці. Пры гэтым функцыі заказчыка пры правядзенні капітальнага рамонту плануецца перадаць упраўленням капітальнага будаўніцтва.

Не абышла ўвагай камісія і пытанні налічэнняў аплаты за разнастайныя камунальныя паслугі, дзе, па меркаванні камісіі, існуюць шматлікія злоўжыванні, асабліва ў таварыствах уласнікаў. Згодна новага праекта указа, мяркуецца, што налічэнні будуць ажыццяўляцца толькі разліковымі цэнтрамі…

З першых жа прапаноў камісіі заўважаецца скіраванасць падрыхтаванага праекта ўказа да яшчэ большага ўзмацнення ролі дзяржавы ў сферы ЖКГ. Пры тым, што ўжо каля 90% жылога фонду краіны знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, дзяржава, як і раней, нават не жадае пацікавіцца меркаваннямі гэтых самых уласнікаў.

Замест падвышэння ролі грамадства ў кантролі за расходваннем фінансавых сродаў і эксплуатацыяй аб’ектаў ЖКГ , як гэта робіцца ва ўсім свеце, нават у камуністычным Кітаі, беларуская дзяржава імкнецца навязаць гэтаму грамадству на ўтрыманне чарговыя дзяржаўныя структуры…

Па словах намесніка міністра, у праект указа ўносіцца пункт, які прадугледжвае ліквідацыю практыкі перадачы арганізацыям ЖКГ стратных і непрофільных аб’ектаў, што цяжарам кладуцца на арганізацыі.

Выносячы падобную прапанову ў праект указа прэзідэнта, працоўная група па ЖКГ, Якабсон, як старшыня КДК, практычна распісаліся ў сваім бяссіллі. Бо яна, гэта камісія, ўжо прымала падобнае рашэнне, якое абавязвала ўсе аблвыканкамы да 1 красавіка 2014 года правесці інвентарызацыю непрофільных актываў і перадаць іх па адпаведных галінах. Бо як, напрыклад, разумець набыццё Магілёўскім гарадскім водаканалам прагулачнага цеплахода за 420 тыс. долараў, калі гэтыя сродкі разам з затратамі на эксплуатацыю карабля ляглі на сабекошт паслугаў арганізацыі і, як след, на плечы гарамадзян.

У падрыхтаваны праект указа ўнесены і іншыя шматлікія пункты, якія заклікаюць працаўнікоў ЖКГ да адказнасці, да аптымізацыі, да павышэння кваліфікацыі, падобна на тое, як гэта гучала з плакатаў часоў КПСС — павысіць, узмацніць, палепшыць…

Нажаль, камісія пад кіраўніцтвам Якабсона так і не правяла дасканалых даследванняў, каб разабрацца ў прычынах правалу рэформаў ЖКГ краіны, падзення ўзроўню якасці, пастаяннага росту кошту камунальных паслугаў, у прычынах зрыву будаўніцтва шматлікіх аб’ектаў ЖКГ, як, да прыкладу, новага водазабору ў Мінску дзеля забяспячэння насельніцтва некаторых раёнаў горада артэзіянскай вадой.

І самае цікавае, што камісія нават не задалась пытаннем, чаму ўсё ж такі беларускім урадам прынята пастанова аб прызнанні Канцэпцыі развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі РБ да 2015 года як страціўшай сілу, і куды падзеліся шматмільярдныя, ў доларах ЗША, фінансавыя сродкі, што ўсе гэтыя гады скіроўваліся на выкананне разнастайных праграм з мэтай рэалізацыі канцэпцыі?

А без адказу на ўсе гэтыя пытанні новы ўказ так і “не страсяне камунальшчыкаў”, а для Лукашэнкі ЖКГ так і застанецца загадкавай краінай у плане тарыфаў.

Рыгор Кастусёў

АЧС В БЕЛЫНИЧСКОМ РАЙОНЕ НЕТ, НО ЖИТЕЛИ ВСЕ РАВНО ОБЕСПОКОЕНЫ

Жители Белыничского района Могилевской области боятся, что свиньи на подворьях погибнут от африканской чумы. Причина – отсутствие официальной информации. В начале июня в подворье Светланы Муравьевой в агрогородке Большие Мощаницы пала свинья. Специалисты взяли анализы у второго животного, закололи его и закопали обе туши в огороде сельчанки. Тут же по району пошли слухи.

Светлана Муравьева: “Я яду панесла, адзін (кабан. - Прим. TUT.BY) не ўзяў есці. Мы за ўрачом паехалі. Ён паглядзеў, даў уколы. І ўсё раўно кабан прапаў - здох. За другім прыехалі з Магілёву”.

На типичной для белорусской глубинки трасянке Светлана Муравьева рассказала, как лишилась большей части своего домашнего хозяйства. По ее словам, вместе с представителем сельсовета и местным ветврачом к ее дому подъехали специалисты “из Могилева”. Они не сказали ей, от чего погибла свинья, почему зарезали вторую, какие анализы брали.

“Хоць бы яны сказалі, як каго па отчыству звацЬ! Эта вабшчэ! Я сіжу во тут на лаўке, а яны паселі па баках і спрашываюць у мяне, як і што было. Вы не прадстаўляеце, як стала мяне калаціць перад імі, сэрца трасецца. Высокі такі мужчына быў - я яго прымеціла - і нейкі такі поўны”, - эмоционально вспомнила женщина день, когда хлев опустел.

Здесь семья Муравьевых держала двух свиней едва ли не всю жизнь - иначе на зарплату не прожить.

После случившегося дважды делали санобработку хлева. “Тут такое балота было – на агарод не прайці”, - заметила хозяйка. К резкому “амбре” домашних животных и сейчас примешивается отчетливый запах медикаментов. Кто именно делал дезинфекцию, она не знает - приехавшие не представились, удостоверений не предъявили.

Руководитель Могилевской областной ветеринарной лаборатории Михаил Лустенков пояснил, что свиней сельчанки поразила обычная инфекция. “В летний период такое случается довольно часто. Опасаться нечего. Если бы это была АЧС, поверьте, положение было бы другим и население бы об этом знало”, - подчеркнул Михаил Васильевич.

Местные рассказали, что очень боятся африканской чумы. Свиней в Большой Мощанице мало кто держит, но эпидемии опасаются все. Ходят слухи, что в лесу недалеко от деревни Заболотье - это в 7 км от агрогородка - видели туши мертвых диких кабанов. В Белыничской межрайонной инспекции охраны животного и растительного мира эту информацию опровергли. Как рассказали корреспонденту TUT.BY в Белыничском лесхозе, к ним подобных заявлений также не поступало.

“Если бы подобный факт был, егеря были бы в курсе, - разъяснил охотовед лесхоза, представившийся Александром Викторовичем. - Они сейчас усиленно патрулируют леса, отслеживают, есть ли туши мертвых животных. Кабаны в этих местах есть. Кстати, был недавно случай. Позвонили, сказали, стоит возле деревни Мокровичи (в 13 км от Большой Мощаницы по дороге. - Прим. TUT.BY) дикий кабан и не двигается. Мы - сразу туда. Приезжаем - нет никого. Спрашиваем, где же тот кабан, а местные говорят: “Только вам позвонили, он развернулся и ушел”. Может быть, что кабанов приняли за мертвых, когда те просто на дневке лежали, отдыхали”.

Сейчас в хозяйстве Муравьевых - куры с цыплятами, молодой бык, пес Блейд да с десяток котов. Пару кабанов растили исключительно для себя. На зарплату главы семьи - около 2 млн рублей - и пенсию по инвалидности супруги прожить невозможно, спасает лишь свое хозяйство. А свиней нельзя заводить целый год. Светлана Викторовна несколько раз повторила, что ей обещали денежную компенсацию и пару молодых быков. Когда - женщина не знает.

***

Слухи о новой вспышке АЧС появляются с завидным постоянством. Только за последнюю

(Окончание на стр. 5)

РАСКРЫТА ТАЙНА ОСУЖДЕНИЯ "ЗАМЕНЫ" ЮРИЯ СИМОНОВА НА ПОСТУ НАЧАЛЬНИКА КЛИМОВИЧСКОГО РОВД

Российские правоохранители сбросили завесу тайны с обвинительного приговора в отношении бывшего начальника Климовичского РОВД и двоих его подельников-милиционеров. «Оборотни в погонах» оказывали услуги по устранению конкурентов.

Напомним, что осуждённый Александр Артёменко заменил на посту начальника Климовичского РОВД полковника Юрия Симонова, который был переведен в Белыничский район и сейчас возглавляет белыничскую милицию. До свойго назначения на должность начальника РОВД Александр Артёменко трудился у Юрия Петровича первым заместителем.

События развивались следующим образом: в январе 2012 года МВД и Следственный комитет сообщили о пресечении преступной деятельности должностных лиц органов внутренних дел и предварительного расследования Климовичского района Могилевской области, вымогавших у российского предпринимателя 500 тысяч долларов.

В группу входили старший оперуполномоченный Климовичского РОВД, старший следователь Климовичского районного отдела управления Следственного комитета по Могилевской области и начальник Климовичского РОВД.

Дополнительно сообщалось, что в отношении задержанных было возбуждено дело по ч. 3 ст. 430 УК (получение взятки в особо крупном размере).

Однако подробности громкого дела остались вне поля зрения журналистов и общественности. Судебный процесс проходил в Борисовском межгарнизонном военном суде за закрытыми дверями.

В марте 2013 года стало известно, что бывший начальник Климовичского РОВД Александр Артеменко получил 11 лет колонии усиленного режима, а его подельники были приговорены к 8 и 9 годам лишения свободы. Их признали виновными в инкриминируемых им преступлениях «коррупционной направленности».

Про эту загадочную историю в Беларуси забыли, но вспомнили в России. Да еще с такими подробностями, что хоть детектив пиши про «оборотней в погонах».

Пресс-служба Следственного комитета России по Брянской области сообщила о завершении следствия в отношении жителя города Клинцы, который «предстанет перед судом по обвинению в подстрекательстве к превышению должностных полномочий правоохранителей из Республики Беларусь».

36-летний Владимир Рухлов обвиняется в подстрекательстве к превышению должностных полномочий, совершенному с причинением тяжких последствий, и в незаконном приобретении, передаче, хранении и перевозке взрывчатых веществ.

По версии следствия, на совершение преступлений Рухлова подвигло желание устранить своих конкурентов в сфере оказания риэлторских услуг. За помощью обвиняемый обратился к начальнику отдела внутренних дел Климовичского РОВД, который привлек к участию в преступной группе двух своих подчиненных сотрудников.

В пресс-релизе сообщается:

«Действуя согласованно с другими соучастниками, Рухлов под предлогом совершения сделки с недвижимостью заманил конкурента на территорию сопредельного государства в город Климовичи, куда 17 декабря 2011 года последний приехал на личном автомобиле вместе со своим родственником. Там в салон их автомашины был подброшен переданный Рухловым пакет, в котором находились взрывчатые вещества (октоген и тротил) и вещество растительного происхождения, схожее по внешним признакам с наркотическим средством — марихуаной».

Белорусские борцы с преступностью «успешно» обнаружили этот криминальный набор, задержали граждан России, посадили

(Окончание на стр. 7)

АЧС В БЕЛЫНИЧСКОМ РАЙОНЕ НЕТ, НО ЖИТЕЛИ ВСЕ РАВНО ОБЕСПОКОЕНЫ

(Оконч. Начало на стр. 4)

неделю в редакцию TUT.BY обращались жители Островецкого и Брагинского районов - по их словам, свиньи гибнут, а по какой причине - неизвестно.

"Ни в одном из названных вами районов - Островецком, Брагинском, Белыничском случаев АЧС не зафиксировано. Поверьте, если бы была вспышка АЧС, мы бы об этом знали", - сообщил TUT.BY заместитель директора Департамента ветеринарного и продовольственного надзора сельского хозяйства и продовольствия Минсельхозпрода РБ Михаил Арешко.

Анжелика Василевская, TUT.BY

АБ ПАСПЯХОВАСЦІ “МАДЭРНІЗАЦЫІ” Ў АСОБНА ЎЗЯТАЙ “НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІЦЫ ДРАЗДЫ”

У апошнія два месяцы 2014 года ў вышэйшых эшалонах беларускіх уладных структур памаленьку сталі заціхаць размовы аб ходзе працэсаў мадэрнізацыі прадпрыемстваў розных галін вытворчасці і “разрульванню” праблемаў у эканоміцы нашай краны. А з надыходам лета і набліжэннем сезона адпачынкаў для чынавенства пытанні мадэрнізацыі прадпрыемстваў і рэфармавання эканомікі адышлі на другі план.

За 2013 і пачатак 2014 года Аляксандр Лукашэнка разам са сваімі паплечнікамі паспрабаваў разабрацца з праблемамі на прадпрыемствах дрэваапрацоўкі, у будаўнічым комплексе, а таксама ў ЖКГ , сельскай гаспадарцы…

Найбольш эфектна, загадкава і нечакана завяршылася “разрульванне” праблемаў у пытаннях мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўкі. Крыху больш чым праз месяц пасля наведвання Барысава кіраўніком краіны, на ААТ “Барысаўдрэў” у ноч з 17 на 18 снежня 2013 года адбыўся пажар. А пажар прыпыніў і ўсялякія размовы на гэтую тэму. Да астатніх прадпрыемстваў дадзенай галіны ўжо, як кажуць, рукі не дайшлі.

Завяршылася чарговым “пшыкам” і дзейнасць працоўнай групы па вывучэнню праблемных пытанняў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы і выпрацоўцы рашэнняў, накіраваных на паляпшэнне спраў у галіне. Дадзеную камісію, створаную распараджэннем кіраўніка дзяржавы ад 4 лютага 2014 г., узначальваў старшыня КДК Якабсон.

І зусім бясслаўна закончылася дзейнасць працоўнай групы, створанай гэтым жа распараджэннем, пад кіраўніцтвам прэм’ер-міністра Мясніковіча для рашэння праблемных пытанняў у аграпрамысловым комплексе. У склад групы ўваходзілі 26 чалавек, у тым ліку старшыня прэзідыуму НАН, намеснік упраўляючага справамі прэзідэнта, старшыні Белстату, Дзяржмаёмасці, Мінскага аблвыканкама; міністр сельскай гаспадаркі разам са сваім намеснікам, намеснікі міністраў эканомікі, фінансаў, МУС, па падатках; генеральныя дырэктары аграрных навукова-практычных цэнтраў, прадстаўнікі банкаў, вядомыя кіраўнікі і спецыялісты сельгаспрадпрыемстваў…

За час працы дадзенай групы значна ўзраслі кошты на шматлікія прадукты харчавання, а некаторыя мясныя вырабы зусім зніклі з паліц магазінаў. А аб прагнозных паказчыках па заробках працаўнікоў сяла за кошт мадэрнізацыі сельгаспрадпрыемстваў да 750 доляраў у месяц і планах выхаду ў 2015 г. на гадавы збор ураджаю зернявых культур у аб’ёме 12 млн. тон ужо нават ніхто з чынавенства і не заікаецца.

Спачыла ў нябыт і Рэспубліканская камісія па вывучэнню сітуацыі ў будаўнічым комплексе пад началам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта…

А як прыгожа ў свой час гучалі завярэнні кіраўніцтва краіны, што ў 2015 годзе кошт будаўніцтва 1 кв.м жылля будзе раўняцца аднаму сярэдняму месячнаму заробку па краіне.

Праўда, як эксперымент, у Беларусі ёсць асобна ўзятыя месцы, дзе праз мадэрнізацыя будаўнічай галіны ў сферы будаўніцтва жылля ўжо ўдалося дасягнуць значных поспехаў, і кошт 1 кв.м раўняецца сярэднемесячнаму заробку, а то і ніжэй. Адным з такіх месцаў з’яўляецца катэджны пасёлак каля вадасховішча Драздзы ў Мінску. Тут атрымалі ўчасткі пад будаўніцтва і пабудавалі або яшчэ будуюцца самыя “нуждающиеся” грамадзяне нашай краіны.

Падобныя “Драздзы” існуюць ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі і іншых буйных гарадах.

Ды як не будавацца “нуждающимся” грамадзянам, калі дзяржава толькі за гэтую пяцігодку ўклала ў “мадэрнізацыю” 30 млрд. доляраў. А за 20-годдзе,

як заявіў Лукашэнка журналістам 10 чэрвеня 2014 г. у час наведвання Сербіі, ад 120 да 130 млрд. доляраў.

Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе “драздоўскі” досвед будзе распаўсюджаны па ўсёй краіне, і астатнія грамадзяне, што дзесяткамі год стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоваў, атрымаюць такую ж магчымасць.

Рыгор Кастусёў

Уладзімір Канаплёў аштрафаваны на 900 базавых велічыняў

17 чэрвеня ў Мінску вынеслі прысуды высокім чыноўнікам.

Былы намеснік генпракурора Архіпаў асуджаны на 6 гадоў калоніі з канфіскацыяй маёмасці. Яго адразу ўзялі пад варту ў зале суда.

Ганаровы грамадзянін Бялыніцкага і Круглянскага раёнаў, былы дэпутат парламента ад нашага рэгёна Уладзімір Канаплёў аштрафаваны на 900 базавых велічыняў (135 млн. рублёў). Яго судзілі за неданясенне аб злачынстве.

ЧТО ДУМАЮТ О “КРЕПОСТНОМ ПРАВЕ” А-ЛЯ ЛУКАШЕНКО НА РОДНОЙ ДЛЯ БЕЛОРУССКОГО ЛИДЕРА ШКЛОВЩИНЕ?

В одном из своих недавних выступлений президент Беларуси Александр Лукашенко потребовал соблюдения “железной дисциплины” в сельском хозяйстве. Белорусский лидер пообещал подписать декрет, который введет “крепостное право”, в том числе, и на селе, когда работники АПК не смогут увольняться или менять сферу деятельности.

Корреспондент DW решил посмотреть, как обстоят дела в сельскохозяйственной отрасли Беларуси и насколько эффективными могут быть жесткие меры, обещанные Лукашенко. Для этого он отправился на родину белорусского президента – в Шкловский район Могилевской области.

Реальная жизнь

Жизнь на пустых, на первый взгляд, улицах деревни Добрейка Шкловского района кипит только возле магазина. Очевидно, половина покупателей приходит сюда за спиртным. Бросается в глаза востребованность - до сих пор - гужевого транспорта. Коня, запряженного в плуг, можно увидеть практически в каждом подсобном хозяйстве Добрейки, хотя автотракторная техника простаивает на машинном дворе местного сельскохозяйственного производственного кооператива (СПК).

Иногда встречаются огороды, на которых люди сами впрягаются вместо лошади. При этом местные жители благодарны властям за то, что Добрейка стала агрогородком. Правда, здесь же оговариваются, что пункт оказания бытовых услуг, недолго поработав, уже закрылся, и вскоре закроется почта.

Руководители сельхозпредприятий из соседних районов, попросившие не называть их имен, признаются, что Шкловщина для них - это предмет зависти. Здесь, считают они, удалось создать экономическое чудо благодаря тому, что, имея статус родины президента, до 70% хозяйств существуют за счет поддержки промышленных предприятий. Та же Добрейка, например, сегодня относится к хозяйству “Газовик-Сипаково”, то есть фактически находится на иждивении предприятия”Могилевоблгаз”. И здесь действительно можно встретить доярку с зарплатой в 700 долларов США.

А в соседних районах в это время процветает пьянство. Часто, признается их руководство, во время уборки урожая приходится увольнять человека по статье, а к посевной брать его обратно. Не секрет, что трактористов, лишенных прав, часто все равно приходится сажать за руль трактора, и госавтоинспекция закрывает на это глаза. Причина банальна - некому работать, и никакие угрозы “крепостным правом” не помогут. Во многих хозяйствах переходить на “военное положение” просто некому.

Парадоксы села

В таких условиях нет другого варианта, кроме привлечения на ответственные участки специалистов из города, а для сбора урожая в поле - студентов и

(Окончание на стр. 8)

РАСКРЫТА ТАЙНА ОСУЖДЕНИЯ “ЗАМЕНЫ”...

(Оконч. Начало на стр. 5)

их в ИВС и, выражаясь языком уголовников, начали их «доить». Пленникам ничего не оставалось, как начать платить за свою свободу.

Согласно имеющимся в материалах уголовного дела показаниям, стоимость выкупа составила 7,5 млн. российских рублей. Но даже после уплаты этих денег вымогательство продолжилось.

Очередная передача 500 тыс. российских рублей происходила 18 января 2012 года в Могилеве уже под контролем оперативников МВД Беларуси. В результате преступники в погонах были задержаны и, как известно, осуждены.

Материалы в отношении подстрекателя Рухлова белорусские правоохранители передали для дальнейшего уголовного преследования российским следственным органам.

Прокурором утверждено обвинительное заключение, и в ближайшее время уголовное дело в отношении Рухлова будет направлено в суд для рассмотрения по существу.

По материалам naviny.by

ЧТО ДУМАЮТ О “КРЕПОСТНОМ ПРАВЕ” А-ЛЯ ЛУКАШЕНКО НА РОДНОЙ ДЛЯ БЕЛОРУССКОГО ЛИДЕРА ШКЛОВЩИНЕ?

(Оконч. Начало на стр. 7)

школьников. Автослесарь одной из могилевских СТО Валерий называет себя типичным примером “помощи селу”. Ежегодно он берет отпуск за свой счет, чтобы в июле-августе сесть за руль комбайна. В среднем за два месяца он планирует заработать 2-3 тысячи долларов, после чего вернется в город чинить автомобили.

Логика тут проста: для горожан управление импортным комбайном “John Deere” будет менее стрессовой ситуацией, чем для сельчанина, привыкшего к отечественной “Ниве”. Кроме того, руководители сельхозпредприятий обращаются за помощью и на заводы, которые командируют своих работников на период уборочной. При этом они не называют ситуацию “авральной”, говорят, что это обычная практика последнего десятилетия.

Ситуация выглядит парадоксально, соглашается житель деревни Добрейка кандидат экономических наук Петр Мигурский, ведь в деревне сегодня одновременно наблюдаются рост безработицы и дефицит квалифицированных кадров. Фермы закрываются, оставляя людей без работы. Это делается, объясняет он, в угоду новым животноводческим комплексам, на которых устанавливается закупленное за валюту импортное оборудование. Но система подготовки кадров заточена под советские образцы техники и не способна подготовить специалистов нужной квалификации. Соответственно, эффекта от вложенных инвестиций нет, и это заставляет руководство страны нервничать.

Что касается угроз президента, то Мигурский уверен, что все действия будут направлены на рядового исполнителя, в то время как основная проблема села



кроется в низком качестве среднего управленческого звена, которое не проявляет инициативы и только ждет указаний президента. Мешают и амбиции руководителей райисполкомов, которых также назначает лично президент. Первым делом на новом месте они начинают переназначать кадры, требуя уважения к себе, но при этом разрушают систему поощрения специалистов.

Военная риторика

Понять логику властей, продолжает Мигурский, можно, зная структуру сельского хозяйства, основой которого остаются СПК – по сути, те же колхозы, только переименованные на современный лад. Учитывая, что фермеры сегодня составляют лишь 1,8% от общего количества сельхозпроизводителей, именно СПК призваны выполнять Программу продовольственной безопасности страны, то есть, фактически должны ее накормить.

Со своей задачей они в принципе справляются, но авторы этой экономической модели ранее игнорировали такие вещи, как рентабельность и эффективность сельского хозяйства. А теперь на них обратил внимание глава государства и остался недоволен.

Заместитель председателя Партии БНФ шкловчанин Григорий Костусев отмечает, что Александр Лукашенко в последней речи сильно злоупотребил военной риторикой, знакомой ему еще с советских времен. В одном тексте, отмечает Костусев, были использованы такие обороты, как “всех перевести на военное положение к уборке”, “все должны быть мобилизованы на заготовку кормов”, “сами себе введете диктат”, и т.д.

В конце 1980-х годов Костусев и Лукашенко почти одновременно стали руководить совхозами, расположенными в соседних районах. Тогда, вспоминает политик, Коммунистическая партия тоже каждый год вела “битву за урожай”. И чем больше было проблем, тем жестче становилась риторика.

Сегодня власть, уверен Костусев, уже поняла, что сельское хозяйство стоит на грани краха. Но проблема в том, что нынешние руководители сельхозпредприятий уже не способны существовать вне командно-административной системы.

Александр Бураков, DW.DE

Анекдот дня

Я свою меру знаю... Упала, значит хватит!

Так как воспитательница детского сада пребывала в процессе развода, дети полгода лепили из пластилина только козлов.

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: 213173, Магілёўская вобл., Бялыніцкі р-н, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Падпісана ў друк 02.07.2014 г. у 17-00.